Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б
і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 268 (337)
ЧАЦВЕР
21
ЛІСТАПАДА
1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПЕРШАЯ СТАРОНКА.

Сустрэць выбары датэрміновым выкананнем лесазагатовак і лесавывазак.—Перадавы артыкул.
Прызыў у рамесленыя, чыгуначныя вучылішчы і школы ФЗА.
Спаборніцтва лесарубаў і возчыкаў.
Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных.
Кандыдаты ў дэпутаты раённага і сельскіх Советаў.
Па Совецкай краіне.
У апошнюю гадзіну.

ДРУГАЯ СТАРОНКА

Кандыдаты ў дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных. (Біяграфічныя нарысы).

ТРЭЦЯЯ СТАРОНКА

На выбарчых участках Беластока.
Жыццё Чырвонай Арміі.
А. Шавелька.—Рыхтаваць да вясны добраякаснае насенне.
І. Якімовіч. Галіна Іосіфаўна Петрак.

ЧАЦВЕРТАЯ СТАРОНКА

Італа-грэчаская вайна: Амерыканскія паведамленні. Баі ў раёне Корчы. Бамбардыроўка вострава Самос.
Англа-германская вайна: Германскія і англійскія паведамленні.

СУСТРЭЦЬ ВЫБАРЫ ДАТЭРМІНОВЫМ ВЫКАНАННЕМ ЛЕСАЗАГАТОВАК І ЛЕСАВЫВАЗАК

Прайшло больш года, як па волі Народнага Сабрання ўсе багацці: фабрыкі, заводы, банкі, зямля і лясы сталі народным здабыткам. Заходнія вобласці БССР з калоніі польскага капіталізма ператвараюцца ў квітнеючы край. Каланізатарская палітыка польскіх капіталістаў асабліва ярка праяўлялася на прыкладах лясной гаспадаркі. У заходніх абласцях ёсць багатыя лясныя масівы. Але лесаапрацоўчая прамысловасць з года ў год скарачалася. Лес бяспланава драпежніцка знішчаўся і вывозіўся за межы гэтых абласцей. Тысячы і мільёны сялян не маглі сабе набыць лесу для будаўніцтва.

Зусім іншае становішча зараз. Лясныя масівы распрацоўваюцца па строгаму плану, праводзяцца новыя лесанасаджэнні. Лес ідзе на задавальненне патрэб нашай прамысловасці. Лес неабходны для задавальнення патрэбнасцей насельніцтва, для нашых абаронных будоўляў. Усё гэта абавязвае нас, совецкіх і лясных работнікаў, прыняць усе меры к датэрміноваму выкананню планаў лесазагатовак і лесавывазак.

Некалькі дзён таму назад у нашай газеце было надрукавана пісьмо стаханаўскай брыгады лесарубаў Стаўбцоўскага леспрамгаса. У гэтым пісьме стаханаўцы-лесарубы звяртаюцца да ўсіх лесарубаў і возчыкаў БССР з заклікам арганізаваць усебеларускае спаборніцтва за датэрміновае выкананне планаў загатовак і вывазак лесу.

Стаўбцоўскія лесарубы пішуць: «У заходніх абласцях нашай рэспублікі набліжаецца дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Гэту вялікую дату мы павінны сустрэць новымі вытворчымі перамогамі. Наша брыгада абавязалася да 15 снежня—дня выбараў—загатовіць звыш плана 2.000 кубаметраў высокаякаснай драўніны і заклікае да гэтага ўсіх лесарубаў і возчыкаў».

Заклік стаўбцоўскіх лесарубаў знаходзіць гарачы водгук сярод стаханаўцаў-лесарубаў і возчыкаў нашай вобласці. Учора мы змясцілі пісьмо стаханаўцаў Саколкаўскага леспрамгаса, якія расказваюць пра вопыт сваёй работы. Жаночая брыгада лесарубаў значна перавыконвае нормы і не адстае ад лесарубаў мужчын—братоў Врублеўскіх. Гэта брыгада выканала свой план больш чым на 200 процантаў. Брыгада возчыкаў гэтага-ж леспрамгаса ў саставе таварышоў Грынашкевіч, Вількевіч, Макарэвіч і іншых выконвае свой план на 150 процантаў. Абмяркоўваючы пісьмо стаўбцоўскіх лесарубаў, стаханаўцы Саколкаўскага леспрамгаса абавязаліся да 15 снежня выканаць план чацвертага квартала.

У нашай вобласці ёсць нямала стаханаўцаў і ў іншых леспрамгасах, якія чэсна і самааддана працуюць, паказваюць узоры высокапрадукцыйнай працы. Уперадзе ідзе Гродненскі леспрамгас (дырэктар тав. Бакман), які ўжо выканаў гадавы план.

Аднак у цэлым леспрамгасы працуюць нездавальняюча. Работнікі леспрамгасаў яшчэ далёка не заключылі дагаворы на неабходную колькасць рабочай і цягавай сілы. Для таго, каб выканаць план, неабходна каб па вобласці ў лесе працавала не менш 3.600 лесарубаў і 6.500 возчыкаў, а працуе-ж менш 10 процантаў гэтай колькасці.

Многае тут залежыць і ад раённых совецкіх і партыйных арганізацый, якія мала кантраліруюць работу леспрамгасаў, недастаткова аказваюць ім дапамогі. Гэта асабліва адносіцца да Ваўкавыскага і Заблудаўскага райвыканкомаў, якія самаўхіліліся ад ходу лесазагатовак і лесавывазак.

Зараз, калі сяляне свабодны ад сельскагаспадарчых работ, ёсць поўная магчымасць заключыць дагаворы на неабходную колькасць рабочай і цягавай сілы. Доўг і прамы абавязак партыйных і совецкіх арганізацый раёнаў—аказаць у гэтым работнікам леспрамгасаў усямерную дапамогу. Дапамога патрабуецца таксама ў пастаноўцы масавай работы, у арганізацыі социялістычнага спаборніцтва. Займаюцца-ж нашы партыйныя арганізацыі сістэматычна справай разгортвання социялістычнага спаборніцтва на прадпрыемствах і ў калгасах. Значыць і лясная прамысловасць не павінна астацца без паўсядзённай увагі і кіраўніцтва. Прадстаўнікі прафсаюзных арганізацый мала бываюць у лесе, слаба звязаны з рабочымі, не выступаюць арганізатарамі социялістычнага спаборніцтва. Гэта становішча павінна быць карэнным чынам зменена.

Дабіўшыся неабходнай колькасці рабочых і возчыкаў на лясных работах, трэба ўсямерна арганізаваць іх на стаханаўскія метады работы. Вопыт стаханаўцаў Стаўбцоўскага і Саколкаўскага леспрамгасаў павінен стаць здабыткам усіх рабочых і возчыкаў.

Працоўныя заходніх абласцей перажываюць зараз вялікія, радасныя дні. Народ вылучыў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных тысячы лепшых людзей. Набліжаецца дзень выбараў, які працоўныя рыхтуюцца сустрэць, як вялікае ўсенароднае свята. У совецкага народа ёсць выдатная традыцыя—кожную знамянальную дату сустракаць новымі перамогамі. У чэсць выбараў разгарнулася спаборніцтва на фабрыках і заводах. Не можа і не павінна астацца ў баку лясная прамысловасць. Доўг партыйных, совецкіх і лясных арганізацый, доўг рабочых лесарубаў і возчыкаў: сустрэць 15 снежня—дзень выбараў—датэрміновым выкананнем планаў лесазагатовак і лесавывазак.

ПРЫЗЫЎ У РАМЕСЛЕНЫЯ, ЧЫГУНАЧНЫЯ ВУЧЫЛІШЧЫ І ШКОЛЫ ФЗА



На здымку: старшыня медыцынскай камісіі, загадчык беластоцкага гарадскога аддзела аховы здароўя тав. М. В. Межэвіч правярае здароўе прызыўнікоў, наступаючых у рамесленыя, чыгуначныя вучылішчы і школы ФЗА. Фота А. Сапіра.

Я буду чыгуначнікам

Мой бацька на чыгуначным транспарце працуе з 1900 года. Цяпер ён з'ўляецца галоўным кандуктарам на ст. Гродна. Я таксама доўгі час марыў аб тым, каб атрымаць у спадчыну прафесію майго бацькі, — авалодаць чыгуначнай справай. Мае мары ажыццявіліся. Мяне прынялі ў Беластоцкае чыгуначнае вучылішча. Бязмежна я рад гэтаму.

Абавязуюся прыкласці ўсе намаганні, каб асвоіць прафесію машыніста, прыкладу ўсе сілы, каб вучыцца толькі на «выдатна».

М. Цуканаў.

Мая радасць

Мяне прынялі ў Беластоцкае чыгуначнае вучылішча. Няма слоў, каб выказаць сваю радасць.

Яшчэ даўно я жадаў пайсці працаваць на чыгунку. І калі даведаўся, што ідзе прызыў у чыгуначнае вучылішча, добраахвотна падаў заяву з просьбай залічыць мяне ў вучылішча.

Медыцынская камісія прызнала мяне годным для вучобы ў чыгуначным вучылішчы. Буду вучыцца на памочніка машыніста. Абяцаю па сканчэнні чыгуначнага вучылішча працаваць на транспарце і быць стаханаўцам.

А. Клімко.

—«о»—

Спаборніцтва лесарубаў і возчыкаў

Высокая выпрацоўка лесарубаў

Заклік стаханаўскай брыгады лесарубаў Стаўбцоўскага леспрамгаса аб арганізацыі социялістычнага спаборніцтва па прыкладу вугальшчыкаў, нафтавікоў, металістаў сустрэў гарачы водгук сярод лесарубаў і возчыкаў Катрынскага лесаўчастка (Беластоцкі леспрамгас).

Уключыўшыся ў социялістычнае спаборніцтва, калектыў гэтага лесаўчастка ўзяў на сябе абавязацельства датэрміново выканаць план IV квартала, павялічыць прадукцыйнасць працы.

Лесарубы Катрынскага лесаўчастка паказваюць прыклад высокапрадукцыйнай працы. Брыгада тав. Трызноўскага штодзённа выконвае план на 190—200 процантаў.

Выдатных поспехаў дабілася таксама брыгада лесарубаў тав. Кавальчука. За кароткі перыяд работы брыгада дасягнула высокай выпрацоўкі і ўжо атрымлівае сезонную прэмію—надбаўку. Брыгада тав. Кавальчука выконвае план на 180 процантаў.

Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных

НІКАЛАЙ ІВАНАВІЧ ВАЛЬКОЎ

Акруговая выбарчая камісія Трасцянскай выбарчай акругі № 66, Кнышынскага раёна, зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Нікалая Іванавіча Валькова, 1893 года нараджэння, члена ВКП(б).

ВАСІЛІЙ ІВАНАВІЧ КУЗНЯЦОЎ

Акруговая выбарчая камісія Сапоцкінскай выбарчай акругі № 80, Сапоцкінскага раёна, зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Васілія Іванавіча Кузняцова, 1894 года нараджэння, члена ВКП(б).

ЮЗЕФА ЯНАЎНА ЯКІМОВІЧ

Акруговая выбарчая камісія Рыгалаўскай выбарчай акругі № 81, Сапоцкінскага раёна, зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Юзэфу Янаўну Якімовіч, 1916 года нараджэння, беспартыйную, брыгадзіра калгаса «Новае жыццё», Галынскага сельсовета.

КСЕНІЯ КАСЬЯНАЎНА ТРАХІМІК

Акруговая выбарчая камісія Вяліка-Грынкаўскай выбарчай акругі № 83, Свіслацкага раёна, зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Ксенію Касьянаўну Трахімік, 1906 года нараджэння, беспартыйную, сялянку вёскі Вялікія Грынкі.

ІВАН СІЛЬВЕСТРАВІЧ УРБІЦКІ

Акруговая выбарчая камісія Лукаўскай выбарчай акругі № 84, Свіслацкага раёна, зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Івана Сільвестравіча Урбіцкага, 1906 года нараджэння, беспартыйнага, памочніка райупаўнаважанага Наркамата загатовак.

ВАСІЛІЙ АЛЯКСАНДРАВІЧ БУРДЗІН

Акруговая выбарчая камісія Азёрскай выбарчай акругі № 87, Скідзельскага раёна, зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Васілія Аляксандравіча Бурдзіна, 1902 года нараджэння, члена ВКП(б), дырэктара Котраўскай МТС.

МІХАІЛ АРСЕНЦЬЕВІЧ ЗАШЫБАЛАЎ

Акруговая выбарчая камісія Цэханавецкай выбарчай акругі № 88, Цэханавецкага раёна, зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Міхаіла Арсенцьевіча Зашыбалава, 1898 года нараджэння, члена ВКП(б).

ІОСІФ ІВАНАВІЧ КУХТА

Акруговая выбарчая камісія Багуцкай выбарчай акругі № 90, Цэханавецкага раёна, зарэгістрыравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Іосіфа Іванавіча Кухта, 1907 года нараджэння, дырэктара няпоўнай сярэдняй школы ў вёсцы Жэрбы-Лясковец, Нурскага сельсовета.

Кандыдаты ў дэпутаты гарадскога і сельскіх Советаў

ГРАЕВА. **(Ад нашага карэспандэнта).** У раёне праходзяць сходы, прысвечаныя вылучэнню кандыдатаў у гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных. На сходзе вёскі Кедзерава кандыдатам у дэпутаты Печкаўскага сельсовета аднагалосна вылучан настаўнік Златкоўскі Балеслаў Баляслававіч. Кандыдатам у дэпутаты таго-ж сельсовета вылучана трактарыстка Граеўскай МТС Сатоўская Марыя Фрыдрыхаўна.

У горадзе Граева закончылася вылучэнне кандыдатаў у гарадскі Совет. Рабочыя, служачыя і інтэлігенцыя вылучылі ў састаў Граеўскага горсовета лепшых людзей, да канца адданых справе партыі Леніна—Сталіна. Рабочыя гума-цясёмачнай фабрыкі вылучылі кандыдатам у гарадскі Совет лепшую стаханаўку-значкістку «Выдатнік лёгкай прамысловасці» Віленскую Рэгіну Абрамаўну. У састаў гарадскога Совета вылучана кандыдатура дырэктара фабрыкі тав. Варабічава Уладзіміра Іванавіча.

Члены спажывецкай кааперацыі вылучылі кандыдатам у гарадскі Совет былога палітзняволенага, зараз актыўнага грамадскага працаўніка і арганізатара работы спажывецкай кааперацыі тав. Маркусфольда Іосіфа Ісакавіча. Тут-жа была вылучана кандыдатура старшыні гарпо тав. Ябко Мотэля Альтэравіча. Сяляне вёскі Бзуры вылучылі кандыдатам у сельскі Совет тав. Сабалеўскага Франца Францавіча.

В. Гарбанёў.

Па Совецкай краіне

НА ВУЧОБУ Ў ДАНБАС

КАЗАНЬ. У Татарыі рыхтуюцца да адпраўкі моладзі, прызванай на вучобу, у іншыя вобласці. З першым поездам у Сталінскую вобласць паедзе тысяча падросткаў.

Комсамольцы-чыгуначнікі прымаюць актыўны ўдзел у арганізацыі абслугоўвання прызыўнікоў на станцыях і ў шляху. Маладыя вагоннікі Казанскага і Юдзінскага вузлоў падрыхтоўваюць рухомы састаў. Паязды суправаджаюць перадавыя брыгады праваднікоў, якія складаюцца пераважна з комсамольцаў.

Чыгуначнікі паклапаціліся і аб культурна-бытавых патрэбах навучаючыхся. У састаў кожнага поезда ўключаецца вагон-рэстаран. Вагоны будуць забяспечаны газетамі, журналамі, рознай літаратурай, музыкальнымі інструментамі, настольнымі гульнямі.

—о—

ЖАНЧЫНЫ-ВУЧОНЫЯ

Звыш 12 з паловай тысяч совецкіх жанчын займаюцца навуковай работай. Сярод іх нямала прафесараў, дацэнтаў, доктараў і кандыдатаў навук. Днямі Вышэйшая атэстацыйная камісія Камітэта па справах вышэйшай школы прысвоіла вучоныя ступені і званні яшчэ тром жанчынам: Н. Т. Шутавай, Т. С. Іетаманавай і М. С. Сканаві-Грыгор'евай.

Дом культуры металургаў Кузнецкага металургічнага камбіната імені Сталіна (гор. Сталінск).
Фота І. Александрава. Фота ТАСС.

РАСКОПКІ СКІФСКІХ ГАРАДЗІШЧАЎ

КІЕЎ. У Кіеў звярнуліся экспедыцыі Інстытута археалогіі Акадэміі навук УССР, якія рабілі раскопкі скіфскіх гарадзішчаў. Яны выявілі новыя цікавыя матэрыялы аб культуры і быце скіфскіх плямён, якія насялялі ў даўнія часы тэрыторыю Украіны.

Адна з экспедыцый раскапвала скіфскае гарадзішча «Каменскія кучугуры» паблізу Нікопаля, якія адносяцца к IV — II вякам да нашай эры. Скіфскія жылішчы гэтага пасялення былі збудаваны па тыпу палевых пабудоў. Велізарную цікавасць прадстаўляюць фартыфікацыйныя ўмацаванні гарадзішчаў. Яны складаліся з рвоў глыбінёй у 4 метры і высокіх валаў, абкладзеных цэглай-сырцом.

Другая экспедыцыя рабіла раскопкі скіфскага гарадзішча VI—V вякоў да нашай эры ва ўрочышчы Шарпаўка, Кіравагра дскай вобласці. Гэтае гарадзішча таксама было акружана сістэмай даўніх фартыфікацыйных збудаванняў. Яны сведчаць аб высокім будаўнічым майстэрстве скіфаў, якія стварылі непрыступныя ўмацаванні вакол сваіх гарадзішчаў.

АДКРЫЦЦЁ НОВАЙ ЭКСПАЗІЦЫІ МУЗЕЯ

Адкрылася новая экспазіцыя музея Л. Н. Талстога ў Маскве.

Пасля ўступнага слова дырэктара музея В. В. Марозава госці прыступілі да агляду выстаўкі, прысвечанай жыццю і творчасці Л. Н. Талстога. У музеі сабран багацейшы фонд рукапісаў геніяльнага пісьменніка. У многалікіх вітрынах — лісткі, пісаныя рукой Льва Нікалаевіча, чарнавікі яго вялікіх твораў. Многалікія варыянты асобных раздзелаў «Анны Карэнінай» гавораць аб велізарнай і напружанай творчай рабоце, праробленай пісьменнікам над раманам.

Выстаўка ярка ілюстрыравана партрэтамі пісьменніка і яго родных, рысункамі к буйнейшым яго творам, гістарычнымі фатаграфіямі, жыва рысуючымі жыццё і творчасць пісьменніка.

—о—

АГІТАТАРЫ-ПАГРАНІЧНІКІ

ПАЎДНЁВА-ЗАХОДНЯЯ ГРАНІЦА. З натхненнем рыхтуюцца да прадстаячых выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і Малдаўскай ССР байцы, камандзіры і палітработнікі Н-скай часці пагранічных войск. Выбарчая кампанія яшчэ больш умацавала іх дружбу і сувязі з насельніцтвам пагранічных сёл. Н-ская часць выдзеліла звыш 60 агітатараў для масава-палітычнай работы ў сёлах.

У апошнюю гадзіну

Далучэнне Венгрыі к пакту трох дзяржаў

БЕРЛІН, 20 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае з Вены: 20 лістапада германскі міністр замежных спраў Рыбентроп, італьянскі міністр замежных спраў Чыяно, японскі пасол у Берліне Курусу, з аднаго боку, і венгерскі міністр замежных спраў Чакі, з другога боку, падпісалі ў Вене пратакол аб далучэнні Венгрыі к тройственаму пакту, заключанаму 27 верасня 1940 года паміж Германіяй, Італіяй і Японіяй.

Ад'езд Антанеску ў Вену

БУХАРЭСТ, 20 лістапада. (ТАСС). Сёння ўвечары глава румынскага ўрада Антанеску выязджае ў Вену для спаткання з Гітлерам. Сумесна з Антанеску выязджаюць міністр замежных спраў Румыніі Стурдза, міністр нацыянальнай эканомікі Канчыкаў і суб-сакратар па справах друку і прапаганды Канстант.

Падрабязнасці налёту на Бірмінгам

БЕРЛІН, 20 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае, што, згодна атрыманых дадатковых звестак аб налёце германскай авіяцыі на Бірмінгам, гэты налёт з'явіўся яшчэ больш апусташальным па сваіх рэзультатах, чым налёт на Кавентры. Пасля таго, як першая партыя германскіх самалётаў скінула свой груз бомб, горад асвятліўся велізарным заравам пажару. Наступная хваля самалётаў, якія стартавалі з узбярэжжа Ла-Манша, беспершкодна следвала да намечанай цэлі. Больш 500 самалётаў зрабілі налёт на Бірмінгам і скінулі бомбы ўсіх калібраў. Усяго было скінута 500 тысяч кілограмаў фугасных бомб. Адначасова былі скінуты тысячы запальваючых бомб. Некаторыя пажары дасягнулі такіх велізарных размераў, што неўзабаве адзін ачаг агню зліваўся з другім. Сярод буйных пажараў, ахапіўшых фабрычныя будынкі, дамы і транспартныя збудаванні, успыхвалі многалікія малыя пажары, якія хутка разрасталіся. Англійская абарона, якая дзейнічала з дапамогай зенітнай артылерыі і пражэктараў, была моцнай і працяглай. Аднак, яна не мела поспеху. Германскія лётчыкі прарвалі загараджальны пояс агню.

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ БЕЛАСТОЦКАГА АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Выбаршчыкі Радзілоўскай выбарчай акругі № 50, Едвабнаўскага раёна! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Макара Клімавіча КОРАБАВА!

★ ★ ★

Макар Клімавіч Корабаў

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*)

Ён пачаў сваё жыццё падобна мільёнам, якіх разнявоіла Кастрычніцкая рэволюцыя. Ён чэсна прайшоў шлях пролетарыя, якога з нізоў, з народных гушчаў паднялі совецкая ўлада і комуністычная партыя.

Усё жыццё Макара Клімавіча Корабава з'яўляецца прыкладам чэснага служэння народу. Ён верны член комуністычнай партыі большэвікоў.

Нарадзіўся тав. Корабаў у 1901 годзе ў падмаскоўнай вёсцы Давыдава, Кураўскога павета. Бацька яго меў сям'ю ў 8 чалавек і меў каля двух гектараў зямлі. Вёска гэта была фабрычная: фабрыкант, які жыў сам у Маскве, фабрыку пабудаваў у падмаскоўі—там капала мужыкоў, якіх выгадней было наймаць на работу, чым гарадскіх рабочых. І малазямельны Клім Корабаў стаў такім чынам на фабрыцы фарбавальшчыкам. Гэта была катаржная, самая цяжкая праца.

Як ні стараўся бацька, 18 рублёў у месяц нехапала на хлеб для сям'і. Малы Макар, старэйшы з дзяцей, правучыўшыся тры зімы ў сельскай школе, таксама пайшоў на фабрыку — «хлопчыкам». А хлопчык тады быў для майстраў і падмайстраў і памочнікам, і служкай, і істотай, на якой можна было зрываць усю злосць. Працавалі не 6 і не 8, а 13, 15 і 16 гадзін у суткі за сем рублёў у месяц.

Падросшы, Макар атрымаў кваліфікацыю снавальшчыка. Стаў бліжэй да старых рабочых, бліжэй да агульнага настрою рабочай масы, у якой спела рэволюцыйная свядомасць. У 1917 годзе 16-гадовы Макар уступіў у профсаюз. А праз тры годы па мабілізацыі профсаюза ён пайшоў на фронт абараняць заваёвы пролетарскай рэволюцыі. У жалезных радах ВЧК, у войсках ГПУ, у атрадах пагранічнай аховы ён змагаўся з белагвардзейцамі і інтэрвентамі, ахоўваў безапаснасць совецкай дзяржавы.

У 1927 годзе тав. Корабаў дэмабілізаваўся і вярнуўся ў родную вёску, на родную фабрыку, якую новыя гаспадары—рабочыя назвалі імёнем Крупскай. Тут уступіў

у партыю. Яго назначылі загадчыкам гаспадаркай. Праз два годы ён накіроўваецца партыяй на работу ў Кантрольную Камісію Рабоча-Сялянскай Інспекцыі Кураўскога раёна.

З 1931 года тав. Корабаў працуе ў органах Рабоча-Сялянскай Міліцыі: спачатку — начальнік раённага аддзялення, затым начальнік гарадскога аддзела. Апошнія годы тав. Корабаў быў начальнікам Віцебскага абласнога ўпраўлення міліцыі. Працоўныя Віцебска ў мінулым годзе выбралі тав. Корабава дэпутатам Віцебскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

Такі шлях рабочага, простага тэкстыльшчыка.

У пачатку 1940 года партыя накіроўвае тав. Корабава ў Беласток начальнікам абласнога ўпраўлення міліцыі. Трэба было падтрымаць рэволюцыйны парадак, стаць на ахову правоў асобы і маёмасці новых совецкіх грамадзян, на ахову соцыялістычнай уласнасці. Работнікам міліцыі прадстаяла змагацца з рэшткамі афіцэрска-асадніцкіх банд, з рознымі злачынцамі, зладзеямі, хуліганамі, спекуляцыйнымі элементамі.

Многія і многія работнікі міліцыі поўнасцю апраўдалі сябе на гэтай рабоце, праявілі самаадданасць, ініцыятыўнасць і ўменне змагацца за соцыялістычны парадак, за ліквідацыю злачыннасці і спекуляцыі. У гэтым немалая заслуга тав. Корабава. Ён сам працуе многа і вучыць працаваць другіх, яго паважаюць, як аўтарытэтнага камандзіра і старэйшага таварыша, за яго дзелавітую прастату, за багаты вопыт.

Нашу совецкую міліцыю любяць па заслугах совецкія грамадзяне, высока цэніць народ. Яе стараннямі насельніцтва агароджана ад злачынных элементаў і хуліганаў. Злодзей, бандыт, хуліган, спекулянт не схаваюцца ад адказнасці перад совецкім народным судом—іх выкрые і знойдзе совецкая міліцыя!

Гэта любоў выражана і ў тым давер'і, з якім зараз працоўныя вылучаюць лепшых работнікаў міліцыі ў кандыдаты мясцовых Советаў дэпутатаў працоўных. Працоўныя Радзілоўскай выбарчай акругі, Едвабнаўскага раёна, сваім кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных вылучылі тав. Корабава Макара Клімавіча.

Дастойны сын рабочага класа, просты тэкстыльшчык, стары работнік рабоча-сялянскай міліцыі, тав. Корабаў будзе дастойным народным выбраннікам.

І Клінаў.

Выбаршчыкі Цэнтральнай выбарчай акругі № 5, горада Беластока! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Ізраіля Хацкелевіча КУРЫЛЬСКАГА!

★ ★ ★

Ізраіль Хацкелевіч Курыльскі

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*)

Аб стаханаўцах і стаханаўскім руху Ізраіль Хацкелевіч Курыльскі чуў яшчэ да вызвалення Чырвонай Арміяй Заходняй Беларусі. У строгай канспірацыі слухаў ён радыёперадачы з Масквы, Мінска, Кіева і іншых гарадоў Совецкага Саюза. Гэтыя радыёперадачы расказвалі праўду аб міжнародным становішчы, аб радасным, шчаслівым жыцці ў Совецкай краіне, аб стаханаўскім руху на соцыялістычных фабрыках, заводах і ў калгасах.

Слова «стаханавец» было для Ізраіля родным і блізкім. Яно неяк своеасабліва западала ў душу, кранала пачуцці. Але быць стаханаўцам Ізраіль Хацкелевіч не мог. Капіталістычныя вытворчыя адносіны сваімі ланцугамі скоўвалі яго вытворчыя здольнасці, праца была невыносным цяжарам.

Толькі совецкая ўлада разнявоіла здольнасці тав. Курыльскага, дала ім прастор для прымянення. У першыя месяцы пасля нацыяналізацыі фабрыкі і ўстанаўлення на ёй новых соцыялістычных вытворчых адносін, ён пераходзіць працаваць на два ткацкіх станкі. Многія рабочыя спачатку не верылі ў яго здольнасці. Але скептыкам скора прышлося расчараваацца. Ізраіль Хацкелевіч Курыльскі ў першы-ж дзень работы на двух станках даў 78 тысяч уточын, значна перавыканаўшы норму.

Праз некаторы час прыкладу Ізраіля Хацкелевіча паследавалі рабочыя ткацкага цэха ткачы тт. Ш. Кац, І. Каплан, Колтун, А. Кац — перайшлі працаваць на двух станках. У цэху разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва двухстаночнікаў.

Надыходзіла вялікае свята — дзень 1 Мая 1940 года. Гэта першы Май, які рабочыя рыхтаваліся святкаваць, стаўшы грамадзянамі вялікай соцыялістычнай радзімы — СССР. Надыходзіў дзень адкрыцця XVIII з'езда Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі. На прадпрыемствах шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва імені XVIII з'езда КП(б)Б. А ў ткацкім цэху 6-га тэкстыльнага камбіната, у якім працаваў тав. Курыльскі, шэсць рабочых яшчэ абслугоўвалі па адному станку. Стала задача, каб увесь ткацкі цэх зрабіць стаханаўскім, каб кожны рабочы цэха абслугоўваў не менш двух станкоў. Гэта пытанне абмеркавалі на сходзе рабочых цэха. Усе рабочыя ўключыліся ў соцыялістычнае спаборніцтва, рашылі працаваць на двух станках кожны. І праз пэў-



ны прамежак часу гэтае рашэнне было ажыццёулена. Усе рабочыя цэха сталі двухстаночнікамі. Гэта быў падарунак рабочых ткацкага цэха радзіме да дня адкрыцця XVIII з'езда КП(б)Б.

Ізраіль Хацкелевіч Курыльскі нарадзіўся ў 1911 годзе ў мястэчку Гарадок, недалёка ад Беластока. Тут, у сям'і беднага ткача-рабочага, прайшло яго дзяцінства.

У перыяд імперыялістычнай вайны фабрыка ў м. Гарадку, на якой працаваў бацька Ізраіля, была спалена. Сям'я Курыльскіх асталася без работы, а гэта значыла без хлеба, без жылля. Далей жыць тут стала немагчымым, і Курыльскія пераязджаюць у Беласток. У Беластоку стары Курыльскі паступае працаваць у дробнае саматужнае прадпрыемства ткачом на ручным станку. Але скора бацька памёр. Ізраілю Хацкелевічу Курыльскаму было тады 12 год. Голад, холад прымушаюць яго падросткам аддаць сябе ў эксплаатацыю фабрыканту.

У 1932 годзе ён працуе на фабрыцы Махая. Умовы працы былі вельмі цяжкія. Працаваць прыходзілася па 14—15 гадзін у суткі а плата была мізэрная. Фабрыка працавала ў год не больш 7 месяцаў. І кожны год амаль поўгода прыходзілася быць беспрацоўным, вандраваць па вуліцах, ад аднаго капіталіста да другога, шукаючы падзённай работы, каб зарабіць на кавалак хлеба.

Калі пачалася вядомая забастоўка тэкстыльшчыкаў г. Беластока, малады рабочы Ізраіль Курыльскі прымае ў ёй самы актыўны ўдзел, змагаецца з штрэйкбрэхерамі. Тэкстыльшчыкі Беластока ідуць паходам на Супрасль, каб далучыць да забастоўкі рабочых супраслеўскіх тэкстыльных фабрык. У гэтым паходзе ўдзельнічае і юнак Курыльскі.

За ўдзел у забастоўцы Ізраіля звальняюць з фабрыкі. Восем месяцаў ён абівае парогі фабрык і заводаў, каб знайсці работу. І толькі пасля доўгіх вандраванняў, перажытых цяжкіх лішэнняў яму ўдаецца паступіць на работу.

У 1934 годзе ён працуе на фабрыцы Каган-Рубінштэйн. На гэтай фабрыцы яго застае верасень 1939 года, прыход доблеснай Чырвонай Арміі. І з першага дня ўстанаўлення совецкай улады ў Беластоку, пераходу фабрык і заводаў у рукі рабочых, ён уключаецца ў актыўную работу па навядзенню новага соцыялістычнага парадку. Як лепшага і свядомага рабочага, уладаючага арганізатарскімі здольнасцямі, рабочыя фабрыкі выбіраюць яго старшынёй фабрычнага камітэта.

Рабочыя цэха і ўсяго камбіната любяць Курыльскага і паважаюць як стаханаўца, як грамадскага працаўніка, як чалавека, чуллівага і добрага таварыша. Агульны сход рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых 6-га тэкстыльнага камбіната аднадушна вылучыў яго кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных для балатыроўкі па Цэнтральнай выбарчай акрузе № 5. Тав. Курыльскі з'яўляецца дастойным кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета. Выбаршчыкі Цэнтральнай выбарчай акругі № 5 аднадушна аддадуць свае галасы ў дзень выбараў — 15 снежня за кандыдатуру тав. Курыльскага.

П. Дудо.

Выбаршчыкі Чыжаўскай выбарчай акругі № 92! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Сямёна Кандрацьевіча ТАЛКАЧОВА!

★ ★ ★

Сямён Кандрацьевіч Талкачоў

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*)

Пагранічны Чыжаўскі раён займае адно з перадавых месц у Беластоцкай области. Раён першым скончыў вясеннюю сяўбу, добра правёў уборку высокага ўраджаю і першым у області здаў дзяржаўныя пастаўкі. Увесь сельскагаспадарчы год з чэсцю закончан.

Немалыя поспехі дасягнуты ў прамысловым, культурным і школьным будаўніцтве.

Аднак гэта толькі скупая інфармацыя. Колькі вялікіх спраў крыецца за гэтым! Партыйныя і непартыйныя большэвікі, тысячы людзей будуюць новае жыццё на гэтым заходнім фарпосце совецкай краіны. Можна апавядаць аб сотнях людзей, якія сваёй працай славяць сябе і свой раён. Можна назваць дзесяткі імён большэвікоў-арганізатараў, якія натхняюць працоўных раёна на вялікія справы, і сярод іх дастойнае месца займае Сямён Кандрацьевіч Талкачоў, першы сакратар Чыжаўскага райкома партыі.

* * *

Біяграфія тав. Талкачова — гэта жыццё многіх тысяч, якія выраслі з нізоў да ўзроўню адказнай партыйнай і совецкай работы.

Сямён Кандрацьевіч Талкачоў нарадзіўся ў 1905 годзе на Магілеўшчыне, у сям'і селяніна - бедняка. Як кожны бядняцкі сын, ён мала вучыўся і на мізэрнай гаспадарцы бацькі не мог сядзець. Сямён пайшоў у батракі. Гэта было цяжкае, гаротнае жыццё.

Рана ён здружыўся з комсамолам, адчуваючы ўсім сваім сэрцам, што яго месца — сярод перадавой моладзі, якая пад сцягам партыі Леніна — Сталіна будуе новае, шчаслівае жыццё. У памятныя студзеньскія дні 1924 года, калі памёр В. І. Ленін, ішлі тысячы лепшых людзей у комуністычную партыю, і малады батрак Сямён Талкачоў паступае ў комуністычны саюз моладзі. З гэтага часу пачынаецца яго актыўная грамадска-палітычная работа. Сямёна можна бачыць сярод батрацкай моладзі ў якасці энергічнага арганізатара і агітатара.

З 1925 года ён на нізавой совецкай рабоце — сакратаром сельсовета. У гэтым-жа годзе Сямён прызываецца ў Чырвоную Армію. Ён вучыцца ў палкавой школе, дзе паказвае ўзоры баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Курсантам палкавой



школы ён паступае ў кандыдаты партыі. З 1927 года — член партыі.

Пасля дэмабілізацыі з Чырвонай Арміі Сямён Талкачоў працуе на кіруючай профсаюзнай рабоце. Ён едзе на вучобу ў Іркуцкую соўпартшколу. Школа — вялікая зарадка для яго далейшай практычнай работы. З 1935 года Сямён Кандрацьевіч — на адказнай партыйнай рабоце.

ЦК КП(б)Б 20 верасня 1939 года накіроўвае яго ў заходнія областці Беларусі. Спачатку ён працуе старшынёй Часовага ўпраўлення Каменна-Кашырскага і Высока-Мазавецкага паветаў. З студзеня 1940 года — ён першы сакратар Чыжаўскага райкома партыі. Вось кароткія жыццёвыя штрыхі былога батрака Сямёна Талкачова.

Сакратар райкома добра ведае свой раён, яго эканоміку, людзей. Па ініцыятыве тав. Талкачова кіруючыя работнікі раёна вывучаюць польскую мову, якую неабходна ведаць ва ўмовах свайго раёна, дзе жыве польскае насельніцтва. Ён можа расказаць пра многіх комуністаў, якія з'яўляюцца ўзорам у рабоце і вучобе, пра пачатак заможнага жыцця ў калгасах Чыжаўскага раёна, пра вялікае комунальнае будаўніцтва.

Сямён Кандрацьевіч можа расказаць пра кожнага вылучэнца з мясцовага актыва. Іх — 196 чалавек. Яны знаходзяцца на розных участках работы. Тав. Талкачоў можа назваць імя тав. Каменоўскага — старшыні сельсовета, агранома МТС Лінькові́ча, настаўніка Хмеля і дзесяткі іншых таварышоў, якія з'яўляюцца надзейнай апорай раённай партыйнай арганізацыі. Людзі, якія 20 год былі ў панскай няволі, прыходзяць цяпер да кіраўніцтва сваёй роднай совецкай дзяржавай.

Раённая партыйная арганізацыя выхоўвае гэтых людзей на традыцыях большэвіцкай пільнасці і непрымірымасці да ворагаў працоўных.

— Кадры рашаюць усё! — падкрэслівае думку правадыра Сямён Кандрацьевіч Талкачоў. Гэтым указаннем правадыра сакратар райкома кіруецца ў сваёй штодзённай рабоце.

Інтэлігенцыя Чыжава і калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Сталіна вылучылі кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета па Чыжаўскай выбарчай акрузе № 92 першага сакратара райкома партыі Сямёна Кандрацьевіча Талкачова. 945 выбаршчыкаў — сяляне вёсак Андрэеўскага, Шульберскага і Мрочкаўскага сельсоветаў аднадушна падтрымалі кандыдатуру тав. Талкачова.

Для большэвіка няма большага шчасця, чым давер'е народа. Гэтым высокім давер'ем будзе даражыць сын народа Сямён Кандрацьевіч Талкачоў.

Г. Майсееў.

Выбаршчыкі Рыгалаўскай выбарчай акругі № 81, Сапоцкінскага раёна! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Юзефу Янаўну ЯКІМОВІЧ!

★ ★ ★

Юзефа Янаўна Якімовіч

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*)

Сход быў бурны.

Так далей працаваць нельга,— гаварылі калгаснікі. — Брыгадзір, які ўхіляецца ад сваіх абавязкаў і дрэнна вядзе ўчот работы, нам не патрэбен.

— Каго-ж выбраць?

І калі хтосьці сказаў: Юзефу, усе змоўклі. Калгаснікі пераглядаліся і ўсміхаліся. Да. Ідэя была добрая. Юзефу ўсе ведаюць. Працуе яна з малых год. Маці яе бядлячка. Сама Юзефа здольная, энергічная і акуратная.

— Як-жа яна, жанчына, зможа кіраваць мужчынамі, цэлай брыгадай, — заявіў хтосьці.

Але тут-жа многія закрычалі:

— Яна зможа, зможа!

І Юзефа сапраўды змагла кіраваць. З раніцы — яна першая ў полі. Расстаўляе сваю брыгаду: жанчын пасылае на бурачныя плантацыі, мужчынам загадвае вазіць угнаенне. Кожнаму ўказвае ўчастак яго работы, дае парады.

Пасля сканчэння работы яна акуратна, чысценька запісвае працадні. Калгаснікі ведаюць, што калі іх брыгадзір запіша, яны атрымаюць правільную аплату за сваю працу. Але Юзефа не толькі добры ўчотчык, яна і добры арганізатар спаборніцтва ў сваёй брыгадзе. Уласным прыкладам яна натхняе другіх на ўдарную работу.

...Вечар. Калгаснікі звяртаюцца з поля, але Юзефа сваёй работы не пакідае. Яна яшчэ доўга сядзіць пры лямпе, падводзіць вынікі дня, намячае план на заўтра.

Вышла ў поле. Глядзіць —усё быццам як раней: вось і залацістая пшаніца, і белая, як снег, грэчка. Але ўсё-ж інакш, чым раней. Гэта ўжо не вузенькія палоскі бядняцкай вёскі, а шырокія загоны калгаса «Новае жыццё». А далей — табачныя плантацыі, на якіх не відаць ужо больш пана Панкевіча. Добра яго памятае Юзефа. Колькі разоў прыходзілася ёй



і яшчэ 30 батракам і беззямельным сялянам працаваць з раніцы да позняга вечара за адзін злоты ў дзень! Але бедлякі не мелі іншага выхаду.

Часта здаралася, што пасля тыднёвай работы батракі прыходзілі да пана Панкевіча, каб атрымаць свае грошы, але яго не было, і жонка са слязамі на вачах адказвала:

—На гэты раз грошай у мяне няма, пачакайце яшчэ тыдзень—два.

І трэба было чакаць. А дома не было ўжо ні кавалка хлеба. У сэрцы кіпеў гнеў.

..Гэта ўжо мінула. Няма больш Панкевіча, секвестратара, які ў беднякоў за падаткі аднімалі апошні кажух.

Калі прышла Чырвоная Армія, беднякі вёскі Пярстунь, Сапоцкінскага раёна, аб'ядналі свае палоскі, да іх далучылі зямлю, аднятую ў памешчыка, і арганізавалі калгас «Новае жыццё». Адной з першых уступіла ў калгас сям'я Юзефы Якімовіч. З усёй энергіяй узялася Юзефа за новую справу. Калі яе выбралі брыгадзірам, яна змагла ўзорна паставіць работу. Цяпер Юзефа з гордасцю ўспамінае пра развіццё калгаса.

Нас 16 сем'яў. Маем коней, кароў, інвентар, 132 гектары зямлі, на якіх сеем пшаніцу, лён, табак; багацеем з кожным днём.

Новае совецкае жыццё цалкам захапіла Юзефу. Калі лепшая даярка калгаса Санчукова прыехала з сельскагаспадарчай выстаўкі з Масквы, Юзефа бесперапынна слухала расказы Санчуковай аб цудоўнай сталіцы нашай краіны. Зараз яна марыць толькі аб Маскве, аб сельскагаспадарчай выстаўцы.

Юзефу ў калгасе цэняць і любяць. Калі пачалася кампанія па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, у вёсцы Пярстунь адбыўся сход сялян. Старшыня калгаса тав. Гармушка звярнуўся да прысутных з пытаннем:

— Каго-ж мы вылучым ад нашай вёскі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных?

І сам адказваў: нашым кандыдатам можа быць Юзефа Якімовіч.

Бура апладысментаў была лепшым доказам, што Гармушка выказаў думкі ўсіх прысутных.

Юзефа Янаўна—лепшы брыгадзір калгаса — вылучана кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета ад Рыгалаўскай выбарчай акругі, Сапоцкінскага раёна. Выбаршчыкі раёна аддадуць свае галасы за Юзефу Янаўну Якімовіч — верную дачку працоўнага народа, стаханаўку соцыялістычнага земляробства.

С. Натансон.

На выбарчых участках Беластока

На ўчастку імені Міцкевіча

Выбарчы ўчастак № 8 імені Міцкевіча змяшчаецца ў памяшканні клуба 6-га тэкстыльнага камбіната. Зала клуба і чытальня ўпрыгожаны плакатамі і лозунгамі. На сталах ляжаць свежыя газеты, журналы і літаратура па пытаннях выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Два дні таму назад на ўчастку выйшаў першы нумар насценнай газеты «Выбаршчык». Газета прыгожа аформлена. Перадавы артыкул «Выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных» расказвае аб значэнні выбараў, аб самай дэмакратычнай у свеце совецкай выбарчай сістэме. На польскай мове змешчан артыкул «Нашы кандыдаты». У ім расказваецца аб кандыдатах у дэпутаты ў абласны і гарадскі Советы. У невялікіх, але змястоўных заметках агітатары тт. Астралогава, Дзінабургская і Федэр пішуць аб вопыце сваёй агітацыйнай работы сярод выбаршчыкаў.

На выбарчым участку імені Міцкевіча працуе 32 агітатары. У арганізаваных імі гуртках займаецца 300 выбаршчыкаў. Праведзены ўжо заняткі па дакладу таварыша Сталіна аб праекце Канстытуцыі, вывучана прамова таварыша Сталіна на сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі горада Масквы. Большая частка агітатараў правялі ўжо заняткі ў гуртках па 5—7 разоў. Асабліва вылучаюцца сур'ёзнай работай на ўчастку агітатары тт. Астралогава, Федэр, Піхоўскі, Дзінабургская, Маркевіч і іншыя.

Участковая выбарчая камісія і акруговыя камісіі цяпер удакладняюць спіскі выбаршчыкаў. У дапамогу прыцягнуты агітатары. Праверка спіскаў ужо заканчваецца.

Участковая камісія (старшыня тав. Дзінабургская) правяла па ўчастку многа масавых мерапрыемстваў. 2 лістапада быў праведзен вялікі вечар выбаршчыкаў, прысвечаны XXIII гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. На вечары была дадзена мастацкая самадзейнасць сіламі Дома народнай творчасці.

Камісія працуе па распрацаванаму плану. Штодзённа на ўчастку ўстаноўлены дзяжурствы членаў камісіі. Выбаршчык заўсёды можа выясніць любое пытанне, звязанае з выбарамі.

Агітатар—брыгадзір укладачнага цэха Беластоцкай табачнай фабрыкі тав. А. К. Алексейчук у час перапынку чытае работніцам Палажэнне аб выбарах.

Фота А. Сапіра Фота ТАСС.

Выправіць блытаніну ў спісках выбаршчыкаў

У сваёй пастанове «Аб утварэнні ў горадзе Беластоку выбарчых участкаў па выбарах у абласны і гарадскі Советы дэпутатаў працоўных», апублікаванай 26 кастрычніка, Беластоцкі горвыканком намеціў размяшчэнне ўсіх выбарчых участкаў у пэўных памяшканнях.

У пастанове, напрыклад, значылася, што 4-ы Куйбышэўскі выбарчы ўчастак 2-й Чырвонаармейскай выбарчай акругі знаходзіцца ў доме № 36 па вуліцы Куйбышэва. Там вывесілі спецыяльную шыльду.

16 лістапада ўвечары мы пайшлі шукаць азначаны ўчастак. Заходзім у дом № 36. Нас ветліва сустракаюць тры жанчыны з дзецьмі.

— Калі ласка, скажыце, тут чацверты выбарчы ўчастак?

— Не, тут няма ўчастка, тут, бачыце самі, толькі жыхары жывуць.

— А тут-жа назначаўся быць участак.

— Так, нават шыльда вісела. Але вось учора толькі нехта, з горвыканкома, напэўна, прыехаў, папрасіў у нас сякеру і збіў далоў шыльду. Куды яе завёз—не скажам, не ведаем.

— А хто па вашай акрузе кандыдат у дэпутаты гарадскога Совета, хто кандыдат у абласны Совет дэпутатаў працоўных?

— Гэтага мы яшчэ не ведаем.

— А ці занесены вы ў спісак выбаршчыкаў, ці правільна вас запісалі?

— Нас тут запісвалі ўсіх, а як у спіску, ці правільна, мы не глядзелі.

Такія-ж адказы мы пачулі ад жыхароў дамоў № 24, 20, 14,10 і іншых дамоў па вуліцы Куйбышэва і жыхароў дома № 23 па вуліцы Горкага, у якім жыве 5 сем'яў — 11 выбаршчыкаў.

У гарадской выбарчай камісіі нам паведамілі, што не адзін 4-ы ўчастак перамешчан, што такіх фактаў маецца 14. І горвыканком рыхтуе спецыяльную пастанову, у якой будзе ўказана, якія ўчасткі перамяшчаюцца ў новыя месцы, бо першапачаткова яны намечаны ў непадыходзячых памяшканнях.

І вось 18 числа мы знайшлі наш 4-ы ўчастак на новым месцы—у канторы 11-й фабрыкі на вуліцы Фурманава. Утульнае і ўпрыгожанае памяшканне. Зручна размешчаны спіскі выбаршчыкаў. Члены акруговых камісій правяраюць спіскі. У гэтых спісках мы заўважылі вялікія недакладнасці і памылкі. Многія грамадзяне занесены ў спісак не па дакументах, а з слоў. І вось вынік. У двух сясцёр з дома № 10 па Куйбышэўскай вуліцы атрымліваюцца розныя прозвішчы: Крушуль Рэгіна Іосіфаўна і Крутуль Ядвіга Іосіфаўна. Грамадзянін Васькоўскі запісан «Вашкоўскі», а яго імя па бацьку запісана «Яхімавіч» замест «Ефімавіч».

Зусім анекдатычныя факты з запісам узросту выбаршчыкаў. Гэта графа запоўнена на машынцы брудна і неахайна. Грамадзянцы Каліноўскай Эўфіміі Тэафільеўне запісан год нараджэння... 11910. У Маморавай Марыі Іванаўны год нараджэння значыцца 1818, у Александровіч Люсі Шарлаўны... 1984. Зусім не запісан год нараджэння ў Елісеевай Антаніны Архіпаўны, Садоўскай Разаліі Адольфаўны, Кругер Дамінікі Францаўны. У грамадзянкі Крушэўскай запісана толькі імя па бацьку—«Александраўна», а ўласнае імя не запісана, год нараджэння не паказан.

Многа і іншых скажэнняў у спісках.

Выбарчыя камісіі і агітатары вядуць зараз праверку спіскаў. Трэба гэту работу паскорыць, каб своечасова ўнесці ўсе выпраўленні, трэба шырэй прыцягваць самых выбаршчыкаў для праверкі правільнасці занясення іх у спіскі.

Участак стаў цэнтрам агітацыйна-масавай работы

Комінтэрнаўская ўчастковая выбарчая камісія № 5 (г. Беласток) да работы прыступіла з некаторым спазненнем — 12 лістапада. Але-ж старшыня камісіі тав. Банькоўскі прыняў усе меры, каб хутчэй наверстаць упушчанае, каб дагнаць перадавыя ўчасткі.

Прыведзена ў парадак памяшканне ўчастка, устаноўлены штодзённыя дзяжурствы членаў камісіі з 6 гадзін вечара да 11 гадзін ночы, у выхадныя дні—з 12 гадзін дня да 11 гадзін ночы. Вывешан спісак выбаршчыкаў, пачата яго праверка.

Выключна трывожныя вынікі паказвае праверка спіскаў. Амаль палова прозвішчаў і імёнаў скажона. Значны процант выбаршчыкаў зусім прапушчан у спісках.

— Для нас стала відавочным,— гаворыць старшыня камісіі тав. Банькоўскі,—што горвыканком фармальна аднёсся да складання спіскаў. Гэта важнейшая работа арганізоўвалася так, каб хутчэй адправіць спіскі на ўчастак, а там... няхай разбіраюцца. І мы імкнемся як мага хутчэй зрабіць тое, чаго не зрабілі ў горвыканкоме.

На другім пасяджэнні камісіі зацверджан план работы. Апрача дзяжурстваў намечана правесці рад іншых мерапрыемстваў. У бліжэйшыя дні, напрыклад, арганізуецца вечар сустрэчы выбаршчыкаў з кандыдатамі ў абласны і гарадскі Советы. Набыта для ўчастка выбарчая літаратура, штодзённа ёсць свежыя газеты.

Пры ўваходзе ў будынак плюшавай фабрыкі вывешана прыгожа аформленая аб'ява з паказаннем месца знаходжання ўчастковай камісіі, акруг і вуліц, якія знаходзяцца на тэрыторыі Комінтэрнаўскага ўчастка. Праход на ўчастак абазначан спецыяльнымі стрэлкамі.

Комінтэрнаўская ўчастковая выбарчая камісія № 5 атрымлівае паўсядзённую дапамогу ад партарганізацыі плюшавай фабрыкі. Агіткалектыў гэтай фабрыкі ў апошнія дні значна палепшыў сваю работу. Праведзен семінар агітатараў, на якім прысутнічалі 64 чалавекі. Кожны агітатар замацован за той ці іншай вуліцай і домам. У кватэрах агітатары правялі ўжо з выбаршчыкамі па некалькі гутарак. Сумесна з выбарчай камісіяй праведзен вечар хатніх гаспадынь.

Акруговыя выбарчыя камісіі №№ 101, 102, 103 і 104, кандыдаты якіх будуць балатыравацца ў Комінтэрнаўскім участку, таксама прыступілі да работы. Яны прымаюць удзел у праверцы спіскаў выбаршчыкаў. Заканчваецца рэгістрацыя кандыдатаў.

Адсутнічае дзяжурства

Наступіў самы адказны этап выбарчай кампаніі. На выбарчых участках разгортваецца вялікая работа, ідзе праверка спіскаў выбаршчыкаў.

Натуральна, што ў такі адказны перыяд патрабуецца асобая чоткасць у рабоце выбарчых камісій. Асабліва вялікая роля дзяжурнага на выбарчым участку.

Прышоў выбаршчык. Ён хоча праверыць, ці правільна ўнесена ў спісак яго прозвішча, ці ёсць ён наогул у спіску. Сваю скаргу, заўвагу выбаршчык ізлагае дзяжурнаму члену камісіі.

У 14-й школе знаходзіцца выбарчы ўчастак № 5. Тут-жа развешаны спіскі выбаршчыкаў. Трэба адзначыць, што многія з іх зроблены неахайна, пястраць памылкамі. Каля паасобных прозвішчаў зроблены адзнакі алоўкам.

Днямі мы пабывалі на гэтым участку. Усе нашы намаганні знайсці дзяжурнага не ўвянчаліся поспехам. Нікога на выбарчым участку з участковай камісіі не было. Выбаршчыкі, якія з'явіліся ў гэты дзень для праверкі сябе ў спісках і знайшлі недакладнасці, не мелі магчымасці пагутарыць з членам участковай выбарчай камісіі.

ЖЫЦЦЁ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Ажыццёўленая мара комсамольца Макрушына

Аб авіяцыі комсамолец Макрушын марыў з дзіцячых год. Радасным і хвалюючым быў для яго адзін з верасnёўскіх дзён 1937 года, той дзень, калі на прызыўным пункце яму сказалі, што ён залічан у авіяцыйную часць Чырвонай Арміі.

З першых дзён прабывання ў РСЧА комсамолец Макрушын усю сваю здольнасць накіраваў на глыбокае вывучэнне новай, любімай спецыяльнасці — складанай авіяцыйнай тэхнікі. Паспяхова скончыўшы школу малодшых авіяцыйных спецыялістаў, тав. Макрушын спярша працаваў матарыстам, а праз год камандаванне вылучыла яго як выдатніка на пасаду авіямеханіка. Два месяцы прапрацаваў ён на баявой машыне. У гэты час фінскія белагвардзейцы пачалі свае правакацыйныя дзеянні ў адносінах да Совецкага Саюза. Радзіма заклікала комсамольца Макрушына для выканання ім свайго свяшчэннага доўгу.

Першае баявое хрышчэнне ён атрымаў скора пасля прыбыцця на фронт. Ні лютыя ветры, ні 40-градусныя марозы, ні небяспека трапіць пад абстрэл ворага—нішто не астанаўлівала комсамольца Макрушына. Удзень і ўночы ён знаходзіўся ля баявых машын, дакладна падрыхтоўваючы іх да палётаў, любоўна аглядаючы кожную дэталь. Ніводная драбязь не выслізгала з яго ўвагі. Ён ведаў, што ў баі любая дробязь можа аказаць сур'ёзны ўплыў на работу матэрыяльнай часткі баявой машыны.

Аднойчы, у адзін з студзеньскіх дзён, калі мароз скоўваў усё жывое, калі сцюжа захлынала дыханне, белафіны падбілі адну з нашых баявых машын. З выведзенымі са строю маторамі, экіпаж самалёта шчасліва прызямліўся на маленькім замерзшым балоце ў глухім лесе, недалёка ад перадавой лініі белафінаў. Замаскіраваўшы машыну, экіпаж накіраваўся па глыбокаму снегу расшукваць сваю базу. Праз тры дні камандзір экіпажа далажыў камандзіру часці аб здарыўшымся, заявіўшы, што трэба замяніць маторы, тады толькі можна будзе выратаваць машыну. Але замена матораў у такіх умовах немагчыма, бо даставіць іх няма на чым. Значыць, машына павінна загінуць?

Комсамолец Макрушын не мог дапусціць нават думкі, што самалёт астанецца адзін у лесе і ці, можа быць, дастанецца трафеяй для белафінаў. Абдумаўшы становішча, ён разам з ваентэхнікамі тт. Ключнікавым, Сіротам і іншымі папрасілі ў камандавання дазволу выратаваць машыну. Дазвол быў дан. Прыляцеўшы на месца вымушанай пасадкі, авіятэхнік агледзеў машыну і яшчэ раз пераканаўся, што ёсць магчымасць выратаваць яе. Ён астаўся адзін каля самалёта, а астатнія таварышы паляцелі за матэрыяламі і прадуктамі. На наступны дзень яны звярнуліся з мінімальным запасам усяго неабходнага.

Мароз скоўваў рух, пальцы качанелі і адмаўляліся згінацца, але комсамолец Макрушын упорна працаваў. Вось зняты маторы. Цяпер трэба чакаць, пакуль даставяць новыя. І баявыя таварышы Макрушына, авіятэхнікі і лётчыкі, на самалёце прывезлі новыя маторы, спусцілі іх і прыняліся за работу. Тры дні і тры ночы ўстанаўлівалі маторы, не думаючы пра сон, пра яду. І калі баявая машына была падрыхтавана, тады толькі комсамолец Макрушын адчуў змораннасць.

Праз два дні выратаваная машына зноў паляцела граміць белафінаў.

Пасля заканчэння ваенных дзеянняў з Фінляндыяй часць вярнулася на сваю базу. Зноў пачалася мірная вучоба. З яшчэ большым упорствам комсамолец Макрушын узяўся за работу і вучобу. Актыўна ўдзельнічаючы ў грамадскім жыцці падраздзялення, ён няўтомна павышае ўзровень сваёй ідэйна-тэарэтычнай веды, самастойна вывучае гісторыю большэвіцкай партыі.

У гэтым годзе комсамолец Макрушын адслужыў тэрмін сваёй службы ў Чырвонай Арміі і павінен быў звальняцца ў доўгатэрміновы водпуск. Але ён так зрадніўся з часцю, што падаў дакладную камандаванню з просьбай аставіць яго на звыштэрміновай службе.

Як аднаго з лепшых выдатнікаў баявой і палітычнай вучобы, партыйная і комсамольская арганізацыі часці вылучылі тав. Макрушына агітатарам па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Ал. Окунеў.

Рыхтаваць да вясны добраякаснае насенне

Высокаякаснае насенне — залог высокіх і ўстойлівых ураджаяў. Работнікі зямельных органаў павінны ўжо зараз узяцца за падрыхтоўку насення да вясны. Аднак некаторыя райземаддзелы яшчэ не ўясвілі сабе велізарнае значэнне своечасовай падрыхтоўкі насення. Мала засыпаць толькі насенне. Яго трэба таксама і захаваць ад псавання.

Зараз, калі калгасы закончылі абмалот яравых культур, трэба неадкладна прыступіць да ачысткі насення. Неабходна скарыстаць усе маючыяся зерняачышчальныя машыны, скласці маршруты і графікі работы па ачыстцы зярна і руху зерняачышчальных абозаў, замацаваць за імі агранома на ўвесь перыяд ачысткі. Перад засыпкай насеннага фонду неабходна зрабіць дэзінфекцыю свірнаў, ачысціць іх ад смецця і пылу.

Ачыстка зярна робіцца зусім ізаліравана, каб папярэдзіць механічнае заражэнне зярна і свірнаў кляшчом і доўганосікам. Перад засыпкай усё зярно прапускаецца праз сартыроўкі, а пасля праз трыер.

У перыяд захоўвання насенных фондаў трэба арганізаваць своечасовы і правільны догляд, устанавіць сістэматычны нагляд за тэмпературай і вільготнасцю зярна. Пры павышаным проценце вільготнасці зярна больш 14 процантаў і тэмпературы зярна 18—24 градусаў ствараюцца спрыяючыя ўмовы для размнажэння шкоднікаў — кляшча і доўганосіка і, наадварот, пры паніжаным проценце вільготнасці да 12—13 процантаў і тэмпературы да 5 градусаў кляшчы гінуць.

Зярно, якое мае павышаную вільготнасць і тэмпературу, павінна перапапачвацца і прапускацца праз ветрагоны. Гэтым самым паніжаецца процант вільготнасці і знішчаюцца кляшчы. У сухія і сонечныя дні абавязкова рабіць праветрыванне свірнаў.

За час захоўвання насенне павінна прайсці двухкратную праверку на вызначэнне ўсхожасці, чыстаты, вільготнасці і заражонасці свірнавымі шкоднікамі праз кантрольна-насенныя лабараторыі. Праверка робіцца папярэдняя і перад сяўбой.

Для знішчэння кляшчоў можна прымяняць нафталін або ачышчаную крэйду. Нафталін прымяняецца толькі ў тых выпадках, калі зярно добра ачышчана і даведзена да насенных стандартаў, калі мае нармальны процант усохласці і вільготнасці; для зернавых,—калі процант вільготнасці не перавышае 14 — 15 процантаў, ільну — 13 процантаў. Зярно, апрацаванае нафталінам, і адыходы ад гэтага зярна ні ў якім выпадку нельга ўжываць на корм. Для апрацоўкі зярна нафталінам бярэцца 250 — 500 грамаў нафталіну на адну тону зярна і добра перамешваецца. Апрацаванае нафталінам зярно захоўваецца асобна ад харчовага і фуражнага.

Абеззаражванне зярна ад кляшча можна рабіць у тых прыстасаваннях, якія зроблены для пратручвання зярна парашком. Зярно, якое мае высокую вільготнасць, рассыпаць тонкім слоем на падлозе і рабіць перыядычна яго перапапачванне. Такім чынам, насенне будзе даведзена да нармальнага проценту вільготнасці.

Трэба сістэматычна рабіць праверку заражонасці свірнавымі шкоднікамі. Пры паяўленні кляшча і доўганосіка прымаць адпаведныя меры для іх знішчэння.

Праўленні калгасаў, кіраўнікі райземаддзелаў, МТС, аграномы павінны прыняць усе меры, каб да вясны было падрыхтавана добраякаснае насенне.

Аграном А. Шавелька.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

23 лістапада, у 8 гадзін вечара, у Доме Чырвонай Арміі адкрываецца **1-я Беластоцкая аб'ядная абласная і гарадская канферэнцыя МОПР'а.**

Працяг канферэнцыі — 24 лістапада з 10 гадзін раніцы ў Доме партыйнай асветы (вул. Талстога, 9).

Выдача мандатаў дэлегатам горада Беластока адбываецца 21 і 22 лістапада, дэлегатам з раёнаў Беластоцкай вобласці—23 лістапада з 9 гадзін раніцы да 8 гадзін вечара ў памяшканні абкома МОПР'а (Совецкая вуліца, 11).

АБКОМ МОПР'а.

КАНДЫДАТЫ У ДЭПУТАТЫ БЕЛАСТОЦКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

Галіна Іосіфаўна Петрак

У кутку ткацкага цэха збітая з дошак невялікая каморка—памяшканне лабараторыі 3-га суконнага камбіната. Тут няма «лабараторнай» цішыні, тонкія сценкі не загароджваюць ад машыннага грукату, але вясёлы размераны шум не перашкаджае займацца лабараторнай работай жвавай светларусай жанчыне.

Лабарантка Галіна Іосіфаўна Петрак вядзе вялікую і важную работу. У лабараторыі кантраліруецца тэхналагічны працэс абноўленай вытворчасці, класіфіцыруецца якасны рэзультат работы ўсіх цэхаў. На совецкай фабрыцы лабараторыя — на варце барацьбы за якасць прадукцыі.

Такі, у асноўным, як-бы круг работы лабаранткі тав. Петрак. Але круг яе грамадскіх інтарэсаў выходзіць далёка за сцены не скромнай лабараторыі, за межы фабрыкі. Сапраўднае прызванне, якому Галіна Іосіфаўна аддае кожную мінуту вольнага часу,—гэта масавая палітычная работа з рабочымі. Увесь агонь сэрца, вопыт і веды яна аддае палітычна-агітацыйнай рабоце ў цэху.

... Вось разам у лабараторыі стала ціха—спыніліся станкі і машыны: абедзены перапынак. Тав. Петрак хутка накіроўваецца на ніжні паверх, у цэх сухой апрэтуры—там сёння заняткі з рабочымі.

Чарговая гутарка—на тэму пра вайну на захадзе. Кароткая чытка апошняй газетнай інфармацыі. Пераказ эканамічнага становішча капіталістычных краін. І ўсё гэта падаецца зразумелай простай роднай мовай слухачоў. Такая гутарка дае многа, і рабочы адчувае сябе абагачаным новымі ведамі.

Гутаркі свае тав. Петрак заўсёды стараецца ўвязаць з надзённымі задачамі. Агітацыя носіць канкрэтны характар. Яна накіравана на тое, каб узброіўшы слухачоў разуменнем сваіх задач, запаліць энтузіязм працы, выхаваць усведамленне, што кожны лішні метр тканіны, выпушчаны камбінатам, гэта ўклад, які памнажае магутнасць совецкай краіны. Часта агітатару прыходзіцца браць наступальны напрамак. Вось адставала ў рабоце рамонтная брыгада, а з гэтай прычыны часта прастойвалі станкі і машыны ў цэхах. Тады Галіна Іосіфаўна ідзе да рамонтнікаў, праводзіць з імі адну, другую гутарку, высвятляе прычыны адставання. Нарэшце, члены рамонтнай брыгады самі высунулі абавязацельства—дабіцца, каб прастояў па віне рамонтнікаў не было.

Так падцягваюцца адстаючыя. За перадавымі ідуць астатнія, дасягаюць агульнага ўздыму. Вынікі ўжо радуюць агітатара: яе стараннем рушана жывая справа!

Галіна Іосіфаўна ідзе ў масу заўсёды з абдуманай, мэтанакіраванай гутаркай, поўнай жывой логікі, сілы фактаў і страснай пераканаўчасці.

Гэта майстэрства рэволюцыйнай агітацыі тав. Петрак набыла даўно, яшчэ ў годы крывавай пілсудчыны. Тады яна, шліфавальшчыца на шкляным заводзе пад Варшавай вяла сярод рабочых прапаганду баявой барацьбы за свае правы, за палепшэнне ўмоў працы і быту рабочых. Гэта прыносіла рэзультаты, рабочыя дабіваліся заваёў. Але служка капітала і эксплаататцы—польская дэфензіва схапіла рэволюцыянерку, а суд прыгаварыў да 8 год турмы.

6 год у цёмных і вільготных засценках правяла Галіна Петрак, палаючы нянавісцю да прыгнятальнікаў, гартуючы цвёрдую волю да новай барацьбы. Да Фардона, гэтай злавеснай турмы, дзе сядзела тав. Петрак, не дайшла Чырвоная Армія. Зняволеныя самі прабілі мур і пайшлі насустрач арміі-вызваліцельніцы.

І вось цяпер тав. Петрак увесь запал свайго чэснага сэрца аддае на карысць той справы, за якую змагалася, на карысць комунізма.

Народ умее цаніць сваіх адданых працаўнікоў. Вось чаму калектыў грэцята камбіната на сваім сходзе, прысвечаным вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты гарадского Совета дэпутатаў працоўных, з такім аднадушшам і захапленнем сустрэў прапанову аб вылучэнні кандыдатуры тав. Петрак, вернай дачкі совецкага народа.

І. Якімовіч.

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

Амерыканскія паведамленні

НЬЮ-ЙОРК, 20 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Юнайтэд Прэс, становішча на фронце ў раёне Корчы не змянілася. Прасунуўшыся ўперад на адну мілю ў раёне гары Морава, італьянцы захапілі ў палон 500 чалавек. Наглядаецца вялікая актыўнасць авіяцыі.

Па маючыхся звестках, замежныя самалёты 100 разоў нарушалі югаслаўскую граніцу. 18 лістапада імі было скінута 6 бомб на югаслаўскую тэрыторыю паблізу возера Прэспа.

Грэчаскія войскі акружылі Корчу і падвяргаюць інтэнсіўнаму абстрэлу адзіную дарогу, якая звязвае італьянцаў з горадам. Італьянскія самалёты бамбардыравалі Ларысу, дзе адзін чалавек забіт і чацвёра ранена. Моцнай бамбардыроўцы падвергліся таксама грэчаскія пазіцыі ў Корчы і ў гарах. Італьянцы, відавочна, пачынаюць падрыхтоўку да контрнаступлення для абароны Корчы. Як перадаюць, к Корчы адпраўлена 65 грузавікоў з італьянскімі войскамі і ўзбраеннем. Учора 4 грэчаскіх ці англійскіх самалёты бамбардыравалі горад і аэрадром Аргіракастрон. Забіта чацвёра і ранена 9 чалавек. На зямлі знішчан адзін італьянскі самалёт.

Італьянскія войскі адбілі атаку грэчаскай кавалерыі, наступаючай на Перата. Забіта 28 і ранена 60 грэкаў.

Па маючыхся звестках, 19 лістапада было збіта 11 італьянскіх самалётаў.

—о—

Баі ў раёне Корчы

АФІНЫ, 20 лістапада (ТАСС). Грэчаская газета «Катымерыні» піша, што італьянскія войскі на паўночным фронце аказалі рашучае супраціўленне, асабліва на подступах да Корчы. Не гледзячы на дзеянне 300 італьянскіх самалётаў, грэчаскай арміі ўдалося поўнасцю ачысціць ад італьянскіх войск горны хрыбет Морава, атрымаўшы такім чынам магчымасць абстрэльваць Корчу з блізкай дыстанцыі.

—о—

БАМБАРДЫРОЎКА ВОСТРАВА САМОС

ЛОНДАН, 20 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што італьянскія самалёты падверглі бамбардыроўцы востраў Самос, які знаходзіцца ў Эгейскім моры. Акрамя авіяцыі, у гэтай аперацыі ўдзельнічалі італьянскія эсмінцы. Нанесены ўрон нязначны.

—о—

ЗВАРОТ ГРЭЦЫІ ЗА ДАПАМОГАЙ ДА ЗША

ВАШЫНГТОН, 20 лістапада. (ТАСС). Выконваючы абавязкі дзяржаўнага сакратара ЗША Уэлес заявіў прадстаўнікам друку, што Грэцыя запрасіла ў ЗША дазволу закупіць аружжа і прадметы ваеннага снаражэння. Уэлес перадаў грэчаскаму пасланніку, што ЗША аднясуцца да гэтай просьбы спачувальна.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 20 лістапада. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе: «У адказ на налёты англійскай авіяцыі на жылыя кварталы Гамбурга, Брэмена і Кіля сотні бамбардыроўшчыкаў скінулі ў ноч на 20 лістапада на прадпрыемствы ваеннай і харчовай прамысловасці Бірмінгама звыш 500 тысяч кілограмаў бомб, часткова самага буйнага калібра. Пажары і ўзрывы былі яшчэ мацней, чым пасля налёту на Кавентры.

У ноч на 19 лістапада германская авіяцыя бамбардыравала Лондан, аэрадромы Мархэм, Крэнуэл. Частка ангараў і сховішчаў загарэлася, частка разбурана. Бамбардыроўцы падвергліся таксама Ліверпуль, Саутгемптон і парты на ўзбярэжжы Ла-Манша.

Англійскія самалёты ў ноч на 20 лістапада скінулі бомбы на жылыя кварталы рада раёнаў і іншыя грамадзянскія аб'екты Германіі. Налёт непрыяцеля на Берлін закончыўся беспаспяхова. Адзін англійскі самалёт скінуў бомбы на гістарычны горад Потсдам. Прычынены тут і ў іншых раёнах Германіі ўрон нязначны.

Непрыяцельская авіяцыя зноў пашкодзіла некалькі бальнічных будынкаў. Збіта 2 англійскіх бамбардыроўшчыкі. Германская авіяцыя страціла 5 самалётаў».

БЕРЛІН, 20 лістапада. Германскае інфармацыйнае бюро перадае, што пасля бамбардыроўкі Бірмінгама ў горадзе ўзніклі больш 20 буйных пажараў, зарава якіх служыла арыенцірам для наступных эскадрыльяў германскіх самалётаў. Абарона была слабай. Зенітная артылерыя не змагла памяшаць дзеянням германскай авіяцыі.

Бірмінгам з'яўляецца цэнтрам сталеліцейнай прамысловасці. Тут знаходзяцца таксама склады імпартных тавараў. У Бірмінгаме размешчаны заводы вогнестрэльнага аружжа і патронныя заводы. У горадзе знаходзіцца вялікі манетны двор, дзе выраблягцца значная частка бронзавых і медных манет Англіі. Акрамя таго, у Бірмінгаме ёсць больш 8 тысяч невялікіх фабрычных збудаванняў.

Двум англійскім самалётам удалося скінуць над Берлінам некалькі запальваючых і фугасных бомб. Загарэліся дахі жылых будынкаў. Пажары былі хутка ліквідаваны.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 20 лістапада. Як афіцыяльна паведамляецца, учора ўдзень германская авіяцыя скінула бомбы толькі паблізу адной з вёсак графства Кент. Разбурэнняў і ахвяр сярод насельніцтва няма.

У ноч на 20 лістапада германскія самалёты на працягу 9 гадзін бамбардыравалі цэнтральныя раёны Англіі. У радзе месц прычынен значны матэрыяльны ўрон. Узнікла некалькі пажараў, якія ўдалося ліквідаваць. У адным з раёнаў краіны моцна пашкоджаны жылыя дамы і іншыя будынкі. Аднак у іншых пунктах Англіі разбурэнні нязначныя. Мяркуюць, што ёсць многа ахвяр.

Налёт на Лондан не насіў вялікіх размераў, хаця і працягваўся з перапынкамі ўсю ноч. У горадзе ёсць разбурэнні.

У баях збіта не менш 5 германскіх бамбардыроўшчыкаў. (ТАСС).

Прыбыццё Гітлера ў Вену

БЕРЛІН, 20 лістапада. (ТАСС). Як перадае германскае інфармацыйнае бюро, сёння раніцой у Вену прыбыў Гітлер.

Сюды-ж прыбылі японскі пасол у Берліне Курусу, венгерскі прэм'ер-міністр Телекі і міністр замежных спраў Чакі. Сумесна з венгерскімі дзяржаўнымі дзеячамі ў Вену прыбыў германскі пасланнік у Будапешце Эрдмансдорф і венгерскі пасланнік у Берліне Стоякі.

Кампанія грамадзянскага непаслушэнства ў Індыі

ЛОНДАН, 20 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што доктар Раджан, былы міністр кангрэсісцкага ўрада Мадрасцкай правінцыі, арыштаван за ўдзел у кампаніі грамадзянскага непаслушэнства.

Гэта першы выпадак арышту былога міністра, старонніка Індыйскага нацыянальнага кангрэса. 14 лістапада ў кампанію грамадзянскага непаслушэнства ўключылася многа іншых членаў кангрэса, уваходзячых у састаў правінцыяльных урадаў Індыі.

Закрыццё граніцы Кітая і Французскага Інда-Кітая

НЬЮ-ЙОРК, 20 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Юнайтэд Прэс, кітайскі ўрад закрыў граніцу з французскім Інда-Кітаем. Чыгуначныя шляхі зносін і паштова-тэлеграфная сувязь перарвана. Гандаль з Інда-Кітаем таксама спынен.



Гор. Аўгустоў. Дом райкома партыі на Першамайскай вуліцы.
Фота А. Сапіра.

Учынак, дастойны савецкага ўрача

17 лістапада ў 11 гадзін вечара мы атрымалі выклік з Граева, у якім гаварылася, што ў Шчучынскую бальніцу дастаўлена ў цяжкім стане дзіцё пасля аўтамабільнай катастрофы. Патрабуецца тэрміновая хірургічная дапамога.

Праз 20 мінут карэта хуткай дапамогі даставіла на ст. Беласток урача 2-й бальніцы тав. Высоцкага.

Прыбыўшы да хворага, тав. Высоцкі канстатыраваў пералом таза, бёдраў і разрыў тонкіх кішок, а таксама з'явы агульнага заражэння. Нельга было траціць ні адной мінуты. Перш чым прыступіць да складанай аперацыі, хвораму неабходна было зрабіць пераліванне крыві. Аказалася, што прывезеная з сабою кроў не адпавядае крыві хворага. Не задумваючыся, доктар Высоцкі аддаў сваю кроў хвораму. Затым ноччу была праведзена складаная аперацыя.

Стан здароўя дзіцяці хоць і цяжкі, але ёсць надзеі на паляпшэнне.

Загадам па абласному аддзелу аховы здароўя тав. Высоцкаму аб'яўлена падзяка.

С. Рапапорт,
намеснік загадчыка аблздрава.

Сярод глуханямых

Цяжкім і бязрадасным было жыццё глуханямых у былой панскай Польшчы, дзе іх не лічылі за людзей, прыраўнівалі да вар'ятаў, здзекаваліся над імі. Сярод глуханямых было пагалоўнае беспрацоўе.

Не тое ў нас, пры савецкай уладзе. Глуханямыя, як і ўсе грамадзяне вялікага Савецкага Саюза, атрымалі на аснове Сталінскай Канстытуцыі аднолькавыя правы: на працу, на адпачынак, на адукацыю. Сярод глуханямых у асноўным ліквідавана беспрацоўе. Для іх адкрыты школы, клуб. Працуючы на вытворчасці, глуханямыя паказваюць узоры стаханаўскай работы.

Рабочы тэкстыльнага камбіната № 2 глуханямы тав. Нетупскі працуе на двух станках, выконваючы норму на 140 — 150 процантаў. Ён занесен на дошку пачота.

Глуханямы Тыкоцкі—зараз выдатнік вучобы.

Глуханямыя не стаяць у баку ад грамадскай і абароннай работы. Многія з іх здалі нормы на значок «Гатоў да процівапаветранай і хімічнай абароны», некаторыя рыхтуюцца да здачы норм на значок «Гатоў да санітарнай абароны».

У Беластоцкім клубе глуханямых праведзен справаздачна-выбарчы сход мопраўскай арганізацыі, на якім глуханямыя актыўна выступалі ў спрэчках і кожны з іх праз перакладчыка гаварыў аб вялікіх дасягненнях Савецкага Саюза, аб задачах МОПР'а і аб тых вялікіх клопатах партыі і ўрада, якія праяўляюцца ў адносінах да раней прыгнечаных народаў. Яны горача дзякавалі таму, хто адкрыў новы шлях у светлае і радаснае жыццё—любімаму Сталіну.

Пры клубе арганізаван гурток па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах у мясцовыя Советы. Гуртком ахвачана 75 чалавек.

Е. Канцавая.

Арганізуем збор металічнага лому

Усе вучні нашай 29-й школы горача адгукнуліся на заклік камсамольскай арганізацыі — збіраць металічны лом і здаваць яго на прыёмачныя пункты.

Збіраючы лом, мы дапаможам нашай дзяржаве будаваць новыя танкі і гарматы. І тым самым будзем садзейнічаць умацаванню абараназдольнасці нашай радзімы.

За першыя дні мы ўжо сабралі больш 500 кілограмаў металу і здалі яго на прыёмачны пункт.

Піонеры і вучні беластоцкіх школ, мы звяртаемся да вас з гарачым заклікам арганізаваць збор металічнага лому!

А. Гільчынскі,
старшыня 3-га атрада.
Х. Рафіткес,
старшыня 1-га атрада.
Х. Рахленка,
старшая піонерважатая.

Падрыхтоўка да юбілею Адама Міцкевіча

Калектыў Дзяржаўнага Польскага драматычнага тэатра дзейна рыхтуецца да юбілею вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча.

На ўрачыстым вечары, які адбудзецца 26 лістапада, артысты тэатра выканаюць урыўкі з «Пана Тадэуша», «Канрада Валенрода» і раду іншых лепшых твораў Міцкевіча. Будуць таксама паказаны інсцэніроўкі двух балад паэта.

Адначасова польскі тэатр падрыхтоўвае спецыяльны вечар-канцэрт, прысвечаны жыццю і творчасці Міцкевіча. У мастацкай форме, у дэкламацыях, інсцэніроўках твораў паэта, чытанні яго пісем да сяброў будзе паказан жыццёвы шлях Адама Міцкевіча.

Дзяржаўны Польскі тэатр БССР у новым тэатральным сезоне пакажа таксама адзін з выдатнейшых твораў сусветнай драматургіі — «Дзяды» Міцкевіча.

—о—

Дапамога многадзетным мацерам

Пасяджэнне Граеўскага райвыканкома было незвычайнае. Прысутнічае многа сялян, рабочых і служачых—вырашаецца пытанне аб дапамозе многасямейным. Старшыня райвыканкома тав. Нядзведзкі зачытвае спісак многадзетных сем'яў і тут-жа ўручае мацерам чэк на атрыманне дзяржаўнай дапамогі.

У сваіх выступленнях мацеры выражаюць глыбокую ўдзячнасць савецкаму ўраду і вялікаму Сталіну за паўсядзённыя клопаты аб дзецях.

Усхваляваную прамову гаворыць сялянка Елена Вальварская. Яна заяўляе:

— Я маю 8 дзяцей. Пры польскай уладзе ніхто аб нас не клапаціўся. У доме часта нехапала хлеба. Аб вучобе дзяцей і гаварыць не прыходзілася. Цяпер усё змянілася. Аб нас, сялянах, пастаянна клапоціцца савецкі ўрад. Я атрымліваю 4 тысячы рублёў. Цяпер мае дзеці будуць добра харчавацца. На атрыманыя грошы мы пабудуем сабе новы дом.

Усяго ў гэты дзень 70 мацерэй атрымалі дзяржаўную дапамогу на суму звыш 120 тысяч рублёў. Радасныя, пакідалі яны зал пасяджэння райвыканкома.

В. Г.

—о—

ТЭЛЕФАНІЗАЦЫЯ СЕЛЬСОВЕТАЎ

На працягу 1940 года ў Беластоцкай вобласці тэлефанізіравана 105 сельсоветаў і 15 МТС.

З 354 сельсоветаў нашай вобласці 198 маюць тэлефоны.

—о—

НОВЫ ГАРАДСКІ КЛУБ

Пачаўся рамонт і пераабсталяванне памяшкання беластоцкага кінотэатра «Радзіма». Тут будзе створан агульна-гарадскі клуб для работнікаў промкааперацыі. На рамонт і абсталяванне клуба адпушчана 200 тысяч рублёў.

Новы клуб адкрыецца к 1 студзеня 1941 года.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—101 Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластокдруку.